# Гомельскі універсітэт



ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 2 (824) | Пятніца, 17 студзеня 1992 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 3 кап.


*Дзённік сесіі*

## АСЕЧКІ НА СТАРЦЕ

Кожны дзень уносіць карэктывы ў вынікі зімовай залікова-экзаменацыйнай сесіі. Даваць поўную справаздачу аб ёй мы не мелі намеру. Ды і зрабіць гэта няма ніякай магчымасці. Можам толькі сказаць, што значная колькасць студэнтаў на ўсіх факультэтах яшчэ не справілася з залікамі і да экзаменаў не дапушчана.

Будучыя правазнаўцы з групы П-12 свой першы экзамен здавалі па логіцы. Яго прымала кандыдат філасофскіх навук В. І. Краўцова. Веды 9-ці





Больш за ўсе нас зацікавіла, які зроблен пачатак першакурснікамі. Бо ад яго, як кажуць, у многім будзе залежыць працяг.

Нагадаем, што самы высокі рэйтынг па атэстатах сталасці маюць першакурснікі педагагічнага патоку матэматычнага факультэта. З 75-ці чалавек тут 61 медаліст. Ці ж пацвердзілі яны вартасць школьных узнагарод на першым універсітэцкім выпрабаванні? Далёка не ўсе.

Самай моцнай на першым курсе матфака лічыцца група М-13. Яна здавала экзамен па матаналізу, які прымаў дацэнт А. У. Гаўрылюк. Калі ўлічваць, што гэта даволі цяжкая дысцыпліна, то агульны вынік можна лічыць паспяховым. 7 чалавек атрымалі выдатныя адзнакі, столькі ж — добрыя, 8 — здавальняючыя. І ўсяго толькі адзін «правал».

Больш кантраснымі аказаліся вынікі ў групе М-11, якая здавала экзамен па аналітычнай геаметрыі дацэнту Л. Я. Палякову. Тут 12 першакурснікаў атрымалі выдатныя адзнакі, але і двоек багата —аж 7.

першакурснікаў яна ацаніла на «выдатна», столькі ж чалавек атрымалі добрыя адзнакі, 10 — здавальняючыя. А вось Р. Федараву і Н. Пятровай першы рубеж адразу пераадолець не ўдалося. Як мінімум, спатрэбіцца яшчэ адна спроба.

**НА ЗДЫМКАХ: 1. Дацэнт кафедры беларускай мовы В. А. Гуліцкая правярае пісьмовыя экзаменацыйныя работы па ўводзінах у мовазнаўства. 2. Студэнт групы Б-13 Станіслаў Рапацэвіч атрымаў па гэтай дысцыпліне «выдатна». 3. Добры настрой пасля экзамена па арганічнай хіміі быў у другакурсніцы біялагічнага факультэта Е. Бетанавай. Экзаменатар — загадчык кафедры хіміі Ю. А. Праляскоўскі ацаніў яе веды вышэйшым балам.**

Фота **У. Чысціка.**



*Для абітурыентаў-92*

## АБ ВЫБАРЫ ДУМАЦЬ ЗАГАДЗЯ

Летась на адным з пасяджэнняў вучонага савета Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны абмяркоўвалася пытанне аб уступных экзаменах у 1992 годзе. Ужо цяпер яно, напэўна, цікавіць і многіх абітурыентаў. Таму мы звярнуліся да першага прарэктара ГДУ — прарэктара па вучэбнай рабоце прафесара М. В. Селькіна і папрасілі яго адказаць на некалькі пытанняў.

**— Ці прадугледжаны якія-небудзь змяненні ў правядзенні ўступных экзаменаў у гэтым годзе?**

— На пасяджэнні вучонага савета універсітэта мы разглядалі праект правілаў прыёму ва універсітэт у 1992 годзе. Аднак нашы правілы павінны адпавядаць правілам прыёму ў ВНУ Рэспублікі Беларусь, якія яшчэ Міністэрствам народнай адукацыі не зацверджаны. Але ўжо цяпер можна сказаць аб мяркуемых змяненнях у правілах прыёму ў параўнанні з леташнімі. Так, ва універсітэт будуць прымацца заявы ад усіх жыхароў рэспублікі, уключаючы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія пастаянна жывуць на тэрыторыі Беларусі. Паступленне асоб з іншых дзяржаў будзе праводзіцца на падставе дагавораў або кантрактаў з поўнай аплатай за кошт прадпрыемстваў, спонсараў і саміх грамадзян.

Ёсць змяненні і па ўступных экзаменах. Яны плануюцца ў залежнасці ад выбранай спецыяльнасці: беларуская мова і літаратура — па беларускай мове і літаратуры (вусна і сачыненне), па рускай мове і літаратуры (вусна з адзнакай «залічана», «не залічана»); руская мова і літаратура — па рускай мове і літаратуры (вусна і сачыненне), па беларускай мове і літаратуры (вусна з адзнакай «залічана», «не залічана». Паступаючыя на ўсе астатнія спецыяльнасці будуць пісаць сачыненне па беларускай мове і літаратуры (з адзнакай «залічана», «не залічана») і здаваць наступныя экзамены: матэматыка; праграмнае забеспячэнне вылічальнай тэхнікі і аўтаматызаваных сістэм; эканамічная інфарматыка і аўтаматызаваныя сістэмы кіравання; гідрагеалогія і інжынерная геалогія; эканоміка і сацыялогія працы; бухгалтарскі ўлік, кантроль і аналіз гаспадарчай дзейнасці — па матэматыцы (вусна і пісьмова);

— фізіка; аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі і кіравання; геафізічныя метады пошуку і разведкі — па фізіцы (вусна), матэматыцы (пісьмова);

— біялогія — па біялогіі (пісьмова), хіміі (вусна);

— геаграфія — па геаграфіі (вусна), замежнай мове (вусна);

— геаграфія з нямецкай мовай — па геаграфіі (вусна), нямецкай мове (вусна);

— гісторыя — па гісторыі Беларусі (вусна), па гісторыі СССР (вусна);

— гісторыя з англійскай мовай — па гісторыі Беларусі (вусна), англійскай мове (вусна);

— правазнаўства — па гісторыі Беларусі (вусна), замежнай мове (вусна);

— фізічная культура — па фізічнай падрыхтоўцы, біялогіі (вусна).

Абітурыенты, якія не вывучалі беларускую мову, будуць пісаць сачыненне на рускай мове па беларускай тэматыцы.

План прыёму фарміруецца на аснове сацыяльнага заказу на падрыхтоўку спецыялістаў, вызначаемага заключанымі дагаворамі паміж універсітэтам, прадпрыемствамі і абітурыентамі. На навучанне без адрыву ад вытворчасці будуць прымацца ў асноўным асобы, якія працуюць па профілю выбранай спецыяльнасці на падставе дагавораў паміж універсітэтам, прадпрыемствамі, арганізацыямі і абітурыентамі.

**— Цяпер вышэйшыя навучальныя ўстановы маюць вялікую самастойнасць, карыстаюцца пашыранымі правамі. У гэтай сувязі ці ёсць перспектывы адкрыцця ў ГДУ новых спецыяльнасцей і спецыялізацый з улікам патрэб нашага рэгіёна?**

— Так, сапраўды, у апошнія гады ВНУ набылі адносна вялікую самастойнасць па многіх напрамках. Летась, напрыклад, мы адкрылі новыя спецыяльнасці «Правазнаўства», «Гісторыя з англійскай мовай». Сёлета плануем набраць студэнтаў для навучання па спецыяльнасцях «Геаграфія» са спецыялізацыяй па нямецкай мове, «Фізічная культура» са спецыялізацыямі — трэнер па віду спорту, арганізатар спартыўна-масавай работы, лячэбна-фізічная культура і масаж. Калі ўдасца, то ва універсітэце адкрыем групы па вывучэнню кітайскай мовы і культуры гэтага народа.

**— Ці будуць праводзіцца датэрміновыя экзамены і хто можа быць дапушчаны да іх?**

— Датэрміновы экзамен, як правіла, будзе праводзіцца для прафесійна арыентаванай моладзі з 25 па 30 мая па беларускай мове і літаратуры (сачыненне з адзнакай «залічана», «не залічана») — для асоб, якія маюць дагаворы, заключаныя з універсітэтам, прадпрыемствамі, арганізацыямі і абітурыентамі на падрыхтоўку спецыялістаў;

— па матэматыцы (пісьмова) або фізіцы (вусна) — для пераможцаў раённых і гарадскіх алімпіяд; навучэнцаў школ «юных» і ВВК пры універсітэце па рэкамендацыі іх кіраўнікоў; асоб, якія маюць дагаворы, заключаныя з прадпрыемствамі, арганізацыямі і універсітэтам на падрыхтоўку спецыялістаў — па матэматыцы, інфарматыцы і фізіцы;

— па адпаведных дысцыплінах — для слухачоў факультэта давузаўскай падрыхтоўкі па рэкамендацыі яго дэканата.

Без уступных экзаменаў будуць залічвацца пераможцы алімпіяд Рэспублікі Беларусь, праведзеных яе Міністэрствам адукацыі ў 1991—1992 г.г. Пераможцы (I, II, III месцы) абласных і Мінскага гарадскога тура алімпіяд (1991—1992 г.г.), праводзімых органамі ўпраўленняў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, будуць вызваляцца ад уступнага экзамена па адпаведнай дысцыпліне з выстаўленнем адзнакі «пяць».

**— Як вядома, фінансавая забяспечанасць вышэйшай школы ў цяперашні час крайне недастатковая. Частку сродкаў калектывы ВНУ павінны зарабляць самі на сябе, у прыватнасці, праз падрыхтоўку спецыялістаў на дагаворных асновах з прадпрыемствамі, арганізацыямі і ўстановамі, а таксама за поўную аплату.**

— Фінансавае забеспячэнне вышэйшай школы заўсёды вялося ў нашай краіне па астаткаваму прынцыпу. На набыццё неабходнага абсталявання, на ўмацаванне сацыяльнай базы выдзялялася столькі, што і гаварыць нават няёмка. Аднак у апошнія гады, дзякуючы дапамозе абласнога Савета народных дэпутатаў і ўласнай ініцыятыве ў набыцці каштоўных сродкаў, універсітэт у гэтым напрамку зрабіў ужо многае. Хаця ўсё роўна нявырашаных задач застаецца шмат. Сёлета мы плануем правесці частку набора абітурыентаў з аплатай поўнага кошту навучання, будзем уводзіць плату на аснове дагавораў і кантрактаў за паўторнае навучанне, атрыманне другой або дадатковай спецыяльнасцей, за розныя формы падрыхтоўкі да здачы ўступных экзаменаў, за платнае прадметнае навучанне і г. д.

**— У якой ступені зацікаўлены кафедры і факультэты ў сваёй камерцыйнай дзейнасці?**

— Наяўнасць дагавораў з прадпрыемствамі на падрыхтоўку спецыялістаў забяспечвае функцыяніраванне любой кафедры. Акрамя таго, калі прадпрыемствы зацікаўлены ў дадатковай спецыяльнай падрыхтоўцы, якая выходзіць за межы вучэбнага плана пэўнай спецыяльнасці, то па дамоўленасці магчыма аплата за гэта. Такія і іншыя дадатковыя грашовыя паступленні, пра якія мы гаварылі вышэй, пойдуць на набыццё навейшай тэхнікі і абсталявання, умацаванне сацыяльнай базы, на ўстанаўленне стабільных надбавак да асноўных акладаў, на камандзіраванне вучоных на стажыроўку за мяжу і г. д. Гэтыя сродкі будуць размяркоўвацца прапарцыянальна ўкладзенай у гэтую дзейнасць працы кафедрам і факультэтам.

Гутарку вёў
**У. БАЛОГА.**

# ПОСПЕХ ЛЁГКА НЕ ДАЕЦЦА

### РАЗВАЖАННІ АБ ВУЧОБЕ, СТУДЭНЦКІМ ЖЫЦЦІ І БУДУЧАЙ ПРАФЕСІІ

**Міхаіл Шаўчэнка — чацвёртакурснік аддзялення беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта. За ўсе гады вучобы ў ГДУ атрымліваў пераважна выдатныя адзнакі. З першага курса — стараста групы. Цяпер — прафорг факультэта, уваходзіў у састаў вучонага савета універсітэта. Пра такіх звычайна кажуць: тыповы прадстаўнік студэнтаў, якія і ў вучобе наперадзе, і ў грамадскім жыцці актывісты. Але чамусьці так ужо атрымалася, што ў апошні час такіх прыкладных і правільных ва ўсіх адносінах студэнтаў іх жа аднакурснікі лічаць дзівакамі. Жыццё наша, з кожным днём усё больш і больш складанае, уносіць свае нялепшыя карэктывы і ў светапогляд моладзі, якая робіць пераацэнку ранейшых каштоўнасцей. Але, на шчасце, не ўсе з яе страцілі тыя якасці, якія цаніліся заўсёды, нягледзячы на разнастайныя жыццёвыя калізіі. Не ўсе дбаюць толькі аб сабе, нават не жадаючы ведаць, што чалавеку, які знаходзіцца побач, патрэбна падтрымка, дапамога ці проста парада. І цяпер адшукаць сярод моладзі чалавека, які браў бы на сябе і клопат аб таварышах па вучобе (маецца на ўвазе абавязкі старасты групы, прафсаюзная работа), няпроста. А Міхаіл з такіх вось «дзівакоў».**

**Сёння ён — госць рэдакцыі газеты «Гомельскі універсітэт», і нам думаецца, што яго разважанні аб студэнцкім жыцці, аб тым, якой ён уяўляе сваю будучую прафесію, будуць цікавыя нашым чытачам-студэнтам.**



— ЗРАБІЦЬ нейкія канкрэтныя вывады, што ж такое студэнцкае жыццё, мне дазваляе «салідны» яго стаж — ідзе чацвёрты год маёй вучобы ў ГДУ. Хачу, каб мяне правільна зразумелі: мае погляды на вучэбны працэс, на быццё студэнцкае наогул могуць падвяргацца сумненню. Нездарма кажуць: колькі людзей, столькі і меркаванняў.

Па-першае, хочацца адразу адзначыць: той, хто прыходзіць ва універсітэт за ведамі, а не проста за дыпломам, будзе літаральна з першых дзён старацца вучыцца па-сапраўднаму. Маю на ўвазе не толькі стараннае наведванне і канспектаванне лекцый, але яшчэ і асабістую цікавасць да прафесіі, на якой спыніў свой выбар — тую цікавасць, што будзе часта прыводзіць цябе ў чытальную залу, бібліятэку, каб адшукаць штосьці дадатковае да сказанага выкладчыкам на занятках. Такая самастойная практычная работа ўключае ў дзеянне ўсе рэзервы памяці, трэніруе, развівае яе. Гэта вучыць больш думаць, аналізаваць самастойна. Поспех жа дасягаецца сваёй галавой і сваімі сіламі. Важна верыць у сябе і свае магчымасці, а менш разлічваць на дапамогу іншых.

Педагогу трэба вельмі добра ведаць літаратуру, шмат чытаць. Не ўсе, праўда, студэнты нашага факультэта гэта любяць рабіць, у чым адна з галоўных іх памылак. Лянота працаваць над сваёй душой, напаўняць яе тым багаццем, якое потым будзеш аддаваць дзецям, сваім вучням, — бяда многіх студэнтаў. А пустую душу настаўніка дзеці вельмі хутка ўбачаць. Бо яны востра адчуваюць фальш, ненатуральнасць.

Піянерская, педагагічная практыкі, якія мы, будучыя філолагі, праходзім летам, даюць магчымасць адчуць, якая гэта няпростая справа — выхоўваць дзяцей, якую адказную прафесію мы сабе выбралі. Мне давялося працаваць у час практык з рабятамі ва ўзросце ад 10 да 12 гадоў, але пытанні, якія яны мне задавалі, былі зусім не дзіцячыя: наша складанае жыццё адбіваецца і на іх светаўспрыманні. І каб знайсці адказы на іх, каб ім усё было зразумела, трэба самому быць «на узроўні».

Я не шкадую, што зрабіў выбар у сваім жыцці — стаць педагогам. Хацеў бы працаваць з дзецьмі ва ўзросце 13 гадоў і вышэй. Гэта той час, калі фарміруецца характар чалавека. Тут патрэбен тонкі і індывідуальны падыход да кожнага вучня, своеасаблівы ключык для яго душы. Спадзяюся, што гэта ў мяне атрымаецца. Хаця, кажуць, самаўпэўненасць не лепшая якасць у чалавека, але ж...

Кажуць, той не сапраўдны студэнт, хто жыве адной вучобай, не зведаў, што такое сумесная праца ў час летніх працоўных семестраў. Што гэта так, давялося пераканацца на ўласным вопыце. Сам неаднаразова быў байцом студатрада. Усведамленне, што твая праца, тваіх сяброў па вучобе камусьці вельмі патрэбная, прыносіць у душу своеасаблівае пачуццё. Апошнім часам, праўда, прэстыж студэнцкіх атрадаў прыкметна знізіўся. Адышлі ў мінулае іх гучныя лозунгі накшталт «Выкананаем і перавыкананаем...» Але ж лічу, што сумесная карысная работа студэнцкай моладзі неабходна. Каб па-сапраўднаму спазнаць, што ж такое студэнцкае жыццё, трэба не быць у баку ад яго, а зведаць усе тыя лепшыя магчымасці, якое яно дае. Не варта жыць па прынцыпу «ад сесіі да сесіі жывецца весела» і «дыплом усё роўна атрымаю...»

**АД РЭДАКЦЫІ:** Магчыма, нейкія думкі Міхаіла Шаўчэнкі пакажуцца некаторым чытачам спрэчнымі. Што ж, усіх, хто пажадае выказаць свае меркаванні наконт закранутых тут праблем, запрашаем да працягу размовы на старонках нашай газеты.

*Слова пра ленінскага стыпендыята*

# ВЫДАТНІКАМІ НЕ НАРАДЖАЮЦЦА, ВЫДАТНІКАМІ СТАНОВЯЦЦА

ТАК часта атрымліваецца, што біяграфія выдатнікаў вучобы, імянных стыпендыятаў укладваецца ў прывычную схему: захапленне яшчэ ў школе тым прадметам, які адыгрывае рашаючую ролю ў выбары прафесіі, добрая парада любімага настаўніка, атрыманне залатога медаля...

Не выключэнне з гэтага пераважаючага стэрэатыпу і лёс пяцікурсніка фізічнага факультэта, ленінскага стыпендыята Уладзіміра Гайшуна. Толькі да ўсяго пералічанага варта яшчэ дадаць: у выбары юнаком прафесіі немалаважную ролю адыграў і зацікаўлены расказ аб спецыялізацыях факультэта яго старэйшай сястры, якая сама вучылася на ім.

І ўсё ж, калі адкінуць знешняе падабенства біяграфій выдатнікаў, якіх навучальная ўстанова ўдастоіла імянных стыпендый (аб іх наша газета расказвае рэгулярна), заўважыш і істотнае адрозненне: кожны цікавы па-свойму. Вось і Уладзімір. Адчуваецца, што юнак вучыўся ва універсітэце не дзеля адных толькі выдатных адзнак, павышанай стыпендыі, славы. Абавязковасць, добрасумленнасць, стараннасць ва ўсім, у першую чаргу ў вучобе, — прыроджаныя яго рысы. Прадметнымі дысцыплінамі авалодваў грунтоўна, а не толькі каб «спіхнуць» іх на чарговым экзамене. На першым і другім курсах даводзілася, канешне, працаваць над сабой больш, чым на старэйшых. Ішоў яшчэ, як кажуць, працэс адаптацыі да студэнцкага жыцця. Далей справы пайшлі лягчэй, з'явілася свая выпрацаваная сістэма падрыхтоўкі да заняткаў, экзаменаў: пастаянная самастойная праца як над абавязковай, так і дадатковай навуковай літаратурай, якую рэкамендаваў яго навуковы кіраўнік, дэкан факультэта І. В. Семчанка.



Калі прыйшоў час зрабіць выбар спецыялізацыі, Уладзімір спыніўся на оптыцы — яе тэарэтычным напрамку. Ён бачыць у ім вялікія магчымасці для даследаванняў.

З першых гадоў вучобы У. Гайшуна вабіла і навуковая работа, плён якой відавочны. Вясной мінулага года Уладзімір прымаў удзел ва Усесаюзнай студэнцкай навуковай канферэнцыі па квантавай электроніцы, якая праходзіла ў Томскім дзяржаўным універсітэце. На секцыйным пасяджэнні канферэнцыі ён выступіў са сваім навуковым дакладам, атрымаў Дыплом II ступені.

Цяпер У. Гайшун праходзіць пераддыпломную практыку на кафедры оптыкі. Яе кваліфікаваныя выкладчыкі дапамагаюць юнаку замацаваць атрыманыя за гады вучобы веды, папоўніць іх. Ідзе праца і над дыпломнай работай. Словам, пара адказная і напружаная. Але Уладзімір знаходзіць час і для свайго любімага захаплення — плавання.

Студэнцкія гады, якія зусім хутка скончацца, для У. Гайшуна, па яго словах, былі цікавымі, насычанымі, плённымі. І гэта дзякуючы таму, што ў іх была вельмі дружная група, з таварыскімі адносінамі і ўзаемаразуменнем, што вельмі важна ў вырашэнні агульных студэнцкіх праблем.

**Т. НІКАЛАЕВА.**
**Фота У. Чысціка.**

# ВЫБРАНЫ ПА КОНКУРСУ

На пасяджэннях вучонага савета універсітэта, якія адбыліся ў лістападзе і снежні мінулага года, на вакантныя пасады загадчыкаў **кафедр** выбраны: кафедры геаграфіі — **Богдэль Іван Іванавіч**, інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі — **Сербін Георгій Анатольевіч**, эканомікі і сацыялогіі працы — **Трацэўскі Ігар Паўлавіч**, педагогікі і псіхалогіі — **Харламаў Іван Федаравіч.**

На пасады **дацэнтаў** выбраны: **Багамольнікаў Уладзімір Уладзіміравіч** — па кафедры ўсеагульнай гісторыі, **Іваноў Юрый Паўлавіч** — па кафедры геафізікі, **Верамееў Васіль Мікалаевіч** — па кафедры заалогіі і аховы прыроды, **Хадалевіч Аляксандр Дзмітрыевіч** — па кафедры алгебры і геаметрыі, **Чарток Валянцін Дзмітрыевіч** — па кафедры алгебры і геаметрыі, **Смародзін Віктар Сяргеевіч** — па кафедры ВМ і праграміравання, **Нарскін Генадзь Іванавіч** — па кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту.

На пасады **старшага выкладчыка** выбраны: **Кандраценка Уладзімір Іванавіч** — па кафедры фізічнай метралогіі, **Сергіенка Міхаіл Іванавіч** — па кафедры фізічнай метралогіі, **Харытошкін Васіль Андрэевіч** — па кафедры фізвыхавання, **Дайнека Мікалай Міхайлавіч** — па кафедры батанікі і фізіялогіі раслін, **Сырадоеў Фёдар Ягоравіч** — па кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту, **Лемяшкоў Уладзімір Сяргеевіч** — па кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту, **Геркусава Таццяна Федараўна** — па кафедры фізвыхавання, **Цітовіч Анатоль Антонавіч** — па кафедры эканомікі і сацыялогіі працы.

# ЗНОЙДЗЕМ СІЛЫ Ў ДУХОЎНАСЦІ

7 студзеня мы адзначылі адно з найвялікшых свят праваслаўных хрысціян — Ражство Хрыстова. Сёлета яно было ўведзена ў ранг агульнанацыянальнага свята, стала афіцыйна выхадным днём.

Вечар, прысвечаны Ражству Хрыстову, адбыўся ў памяшканні абласнога драматычнага тэатра. У канцэртнай праграме свята разам з іншымі творчымі калектывамі горада прыняла ўдзел народная харавая капэла «Дзянніца» нашага універсітэта, якой кіруе М. А. Казлоў. Яе ўдзельнікі, нягледзячы на напружаны час зімовай экзаменацыйнай сесіі, калі на ўліку кожная мінута, усе ж змаглі сабрацца і выступіць перад шырокай аўдыторыяй слухачоў, якая цэніць і разумее духоўную музыку, яе высокае прызначэнне. У выкананні «Дзянніцы» прагучалі тры творы — малітва на музыку А. Архангельскага «Памілуй нас, Божа!», «Скінія № 5», «О, Марыя, маці Бога».

## У ВНУ краіны

**Кіеў.** Незваротна адыйшлі ў мінулае «імянныя» студэнцкія стыпендыі — імя Брэжнева, Усцінава, Суслава. На змену ім прыйшлі новыя. Паліграфічна выдавецкі комплекс пры ўсесаюзным часопісе «Европа», які выходзіць у Днепрапятроўску, устанавіў ганаровыя стыпендыі студэнтам Кіеўскай духоўнай семінарыі. З гэтага часу семінарысты атрымаюць: I стыпендыю — імя мітрапаліта Кіеўскага Пятра Магілы, 2 другіх — імя рэктара Кіева-Магілянскай акадэміі Феафана Пракаповіча і архіепіскапа Растоўскага Дзмітрыя Тупталы; 4 трэціх — імя Б. Хмяльніцкага, Петраса Сагайдачнага, Мітрапаліта Іларыёна, епіскапа Кірылы Тураўскага. Умовы атрымання стыпендый — паспяховае авалоданне багаслоўскай і філасофскай спадчынай Украіны.

**Сімферопаль.** Колькі зараз каштуе студэнцкая кроў? Здаўшы 300 мл. крыві, 108 студэнтаў Сімферопальскага дзяржуніверсітэта сталі шчаслівымі ўладальнікамі талонаў на набыцце дэфіцытных тавараў у цэнтральным універмагу горада. Цяпер донар мае права набыць жаночай бялізны, мужчынскіх касцюмаў і туфель на суму да 100 рублёў. Сёння студэнтаў ВНУ мучыць адно пытанне: калі і за колькі апошні раз куплялі гэтыя дэфіцытныя тавары асобы, якія прымалі гэта рашэнне?

**(«Студенческий меридиан» № 12, 1991 г.).**

## Мацнейшыя спартсмены года

# ШЭСЦЬ З ДЗЕСЯЦІ — НАШЫЯ

Па традыцыі спартыўныя спецыялісты і трэнеры вызначылі дзесятку мацнейшых спартсменаў Гомельшчыны па выніках іх выступленняў у сезоне 1991 года. Прыемна адзначыць, што сярод дзесяці мацнейшых — шэсць выхаванцаў факультэта фізічнай культуры нашага універсітэта. Называем іх прозвішчы ў алфавітным парадку:

**Вугар АРУДЖАЎ** — першакурснік, чэмпіён свету па вольнай барацьбе, заслужаны майстар спорту (трэнер — заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь Ж. А. Джангіраў).

**Аляксандр БАРЫСЕНКА** — студэнт трэцяга курса, чэмпіён свету па сучаснаму пяцібор'ю, майстар спорту міжнароднага класа (трэнер — заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь А. У. Герасімёнак).

**Жана ДАЛГАЧОВА** — студэнтка-завочніца другога курса, чэмпіёнка Еўропы па сучаснаму пяцібор'ю, майстар спорту міжнароднага класа (трэнеры — заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь В. А. Гулевіч і заслужаны трэнер Рэспублікі Грузія Ю. С. Мурамцаў).

**Андрэй ПЛІТКІН** — студэнт IV курса, бронзавы прызёр чэмпіянату свету па веславанню на байдарках і каноэ, майстар спорту міжнароднага класа (трэнер — В. С. Гарбачова).

**Алена РУДКОЎСКАЯ** — студэнтка II курса, трохразовая чэмпіёнка Еўропы па плаванню, майстар спорту міжнароднага класа (трэнер — заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь — Б. З. Лаўрова).

**Сяргей СМАЛЬ** — студэнт-завочнік IV курса, чэмпіён свету па вольнай барацьбе, заслужаны майстар спорту (трэнеры — заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь С. А. Гарло і заслужаны трэнер Расіі С. Р. Хачыкян).

**Горача віншуем нашых мацнейшых спартсменаў з высокімі дасягненнямі. Ва ўсіх іх ёсць добрыя шанцы заваяваць сёлета пуцёўкі на летнія Алімпійскія гульні і дастойна абараніць на іх спартыўны гонар Рэспублікі Беларусь.**

## Парады дае ўрач

# АБ СВАІМ ЗДАРОЎІ

## ТУРБУЙЦЕСЯ САМІ

Нягледзячы на тое, што шмат гавораць па тэлебачанню, радыё і шмат пішуць ў прэсе аб радыяцыі, многія не ведаюць аб элементарных мерах абароны ад гэтай нябачнай, а таму больш грознай небяспекі. І гэта нябачнасць заспакойвае, яна згладжвае, прытупляе вастрыню праблемы, з якой жыць нам цяпер, на жаль, вечна. Паставіўшы рад пытанняў і даўшы на іх кароткія адказы, хочацца спадзявацца, што яны не застануцца без увагі.

**Як харчавацца ва ўмовах радыяцыі?**

**Вядома, што мяса і малако як раз тыя** прадукты, што лічацца асноўнымі пастаўшчыкамі бялку ў арганізм і накопліваюць найбольшую колькасць радыенуклідаў.

Па-першае, не рэкамендуецца варыць булёны на касцях. З мясных прадуктаў найменшае ўтрыманне радыеактыўных часцінак у свініне і птушцы. Што датычыцца малака, то з павышэннем утрымання тлушчу ў прадукце: смятанка — вяршкі — масла, ідзе зніжэнне ўзроўню ўтрымання радыенуклідаў. Свежамарожаная марская рыба па энергетычнай каштоўнасці, засваяльнасці і бяспецы найбольш пажаданая.

Што датычыцца гародніны, то мэтазгодна вымачваць яе ў перад ужываннем, здымаць шалупінне з бульбы, морквы, буракоў, паколькі выбару ў нас ўсё ж няма, пакуль мы не забяспечаны і наўрад ці будзем забяспечаны сельгаспрадуктамі з «чыстых» раёнаў. Трэба сачыць за тым, каб садавіна была на стале пастаянна, таму што ўтрыманне ў ежы грубай клятчаткі садзейнічае хуткаму апаражненню кішэчніка.

Неабходна ўжываць як мага больш вітамінаў: у любым выглядзе і рэгулярна, свежую садавіну і сокі. Напрыклад, адна шклянка соку журавін садзейнічае вывядэнню 70% радыяцыі, накопленай за месяц. Тое ж датычыцца соку чорных парэчак, вінаграду. Некаторыя спецыялісты рэкамендуюць штодзённы прыём па 1 сталовай лыжцы чырвонага віна або каньяку.

Многіх непакояць пастаянна абвастраемыя танзіліты, фарынгіты, проста непрыемныя пачуцці, пяршэнне ў горле. І прырода гэтых з'яў незаўсёды запаленне, выклікане прастудай. Забруджаная радыенуклідамі ежа праходзіць менавіта па задняй сценцы глоткі, туды ж асядае пыл, удыхаемы з паветрам. У выніку — набуханне, гіпертрафічныя змяненні слізістай абалонкі. У гэтым выпадку ўсім рэкамендуецца паласкаць горла содава**ёдным растворам і хаця б** раз у тыдзень апрацоўваць горла і міндаліны растворам Люголя.

Цяпер **аб рэжыме працы і адпачынку.** Сон павінен быць не менш чым 8-гадзінным. Асабліва ў час экзаменаў. Абсалютна супрацьпаказаны начныя сядзенні за кнігамі.

**Думаю, што няма** неабходнасці яшчэ раз гаварыць аб тым, што курэнне скарачае наша жыццё. Дастаткова нагадаць, што 1 пачак цыгарэт, які штодзённа выкурваецца на працягу года, адпавядае праходжанню чалавекам рэнтгенаграфіі да 300 разоў. Што яшчэ можна каменціраваць? Гэта па дадзеных японскіх даследчыкаў.

Аматарам спорту і тым, хто займаецца ім прафесіянальна, рэкамендуецца зніжэнне нагрузак. Для тых, хто не мае супрацьпаказанняў (захворванні сасудаў і сэрца, легкіх і інш.) вельмі карысная сауна.

У памяшканні, асабліва інтэрнатах, неабходна штодзённая вільготная ўборка.

Вось, у асноўным, і ўсё, аб чым мне хацелася папярэдзіць, і дай БОГ усім нам здароўя.

**В. АНДРЫЯНУВІНА,**
**урач медпункта ГДУ.**

## Даведка юрыста

# ВОДПУСК ПАВЯЛІЧАНЫ

Распараджэннем Мінфіна БССР № 07—172/9 ад 31.07.91 і Дзяржкампрацы БССР № 03—5/188 ад 31.07.91 прызнана мэтазгодным прадастаўляць за перыяд з 12 мая 1991 года штогод аплачваемыя водпускі працягласцю 30 каляндарных дзён працуючым у зоне пражывання з ільготным сацыяльна-эканамічным статусам (шчыльнасцю забруджвання глебы цэзіем-137 ад 1 да 5 Кю/кв. км).

Звыш водпускаў указанай працягласці прадастаўляецца дадатковы водпуск за работу ў шкодных ўмовах. Калі іншымі актамі прадугледжаны для працуючых водпуск большай працягласці, то вышэй указаны водпуск на іх не распаўсюджваецца.

За перыяд працы, які папярэднічае 12-му мая 1991 г., працягласць водпуску працуючым у зонах радыеактыўнага забруджвання вызначаецца па дзейнічаючых у той час нормах.

З 1 ліпеня 1991 г. дародавы водпуск жанчынам, пражываючым у зонах радыеактыўнага забруджвання, прадастаўляецца працягласцю 90 каляндарных дзён.

**В. РУПІН,**
**юрысконсульт ГДУ.**

## Абрады —

# ДЗЯВОЧЫЯ ГАДАННІ — ВАРОЖБЫ

**З**АКЛЮЧНЫ этап Калядаў — з новага году (13 студзеня) да Вадохрышча (19 студзеня) — гэта час дзявочых гаданняў-варожбаў. Дзяўчаты гадалі сам-насам або невялікім гуртам, каб даведацца аб тым, ці адбудзецца ў надыходзячым годзе іх вяселле. Немалаважным лічылася з дапамогай гаданняў вызначыць характар, узрост, прафесію будучага мужа. Гаданні праводзіліся ў незвычайнай, таямнічай атмасферы, яны суправаджаліся такімі ж незвычайнымі, «чароўнымі» дзеяннямі, што павінна было забяспечыць іх поспех.

Нярэдка мэтаю гаданняў было атрыманне адказу на пытанне аб тым, ці выйдзе замуж дзяўчына ў новым годзе. Дзеля гэтага выкарыстоўвалі розныя прадметы або звярталіся да дапамогі жывёл. Ставілі, напрыклад, пасярод хаты дзяжу, і дзяўчаты па чарзе, стаўшы перад парогам і павярнуўшыся да яе спіной, ішлі да дзяжы. У тым выпадку, калі дзяўчына «трапляла», г. зн. садзілася на дзяжу, гэта прадвяшчала ёй вяселле. Некалькі дзяўчат клалі ўначы на падлозе хаты свае пярсцёнкі; пасля прыносілі ў хату курыцу або пеўня і назіралі, чый пярсцёнак птушка спрасонку «клюне» першым — той дзяўчыне і замуж ісці першай. Дзяўчаты хадзілі таксама ў хлеў і лавілі ў цемнаце авечак: калі зловіць дзяўчына барана — выйдзе замуж, калі авечку — будзе ў гэтым годзе «сядзець у дзеўках».

Папулярнымі былі і гаданні з удзелам сабакі: гэтая жывёла лічылася вельмі здольнай прадказваць лёс. Дзяўчаты пеклі з рэшткаў цеста маленькія булачкі, клалі іх на парозе хаты, прыводзілі ў хату сабаку і назіралі: чыю булачку сабака з'есць першай, тая дзяўчына першая і замуж выйдзе. Часта звярталіся не да канкрэтнага сабакі, а да... сабачага брэху. Дзяўчына апоўначы выходзіла на двор (на сметнік або на папялішча, дзе смалілі перад Калядамі свінню) і ўважліва слухала, з якога боку забрэша сабака — адтуль і сватоў чакаць. Найбольш смелыя дзяўчаты выходзілі ноччу слухаць сабачы брэх на ростані (вельмі небяспечнае, звязанае з дзейнасцю «нячыстай сілы» месца), прычым не проста ішлі, а «ехалі» на качарзе або на мятле. Заўважалі таксама, які быў сабачы брэх: калі задзірысты, звонкі — будзе жаніх малады, калі глухі, грубы — жаніх будзе стары.

Але найчасцей пры гаданнях імкнуліся атрымаць больш канкрэтныя «звесткі» пра суджанага, і ў першую чаргу хацелі даведацца, хто менавіта (калі «прэтэндэнтаў» было некалькі) будзе жаніхом. З гэтай мэтаю дзяўчына ў адзін з вечароў ела якую-небудзь салёную страву або выпівала шклянку салёнай вады і загадвала перад сном: хто ёй прысніцца і хто напоіць яе вадой, той і будзе жаніх. Клалі таксама пад падушку рэшткі ежы і, засынаючы, запрашалі жаніха прыйсці на вячэру. Хто ў дзявочым сне «прыйдзе» да яе вячэраць — той і жаніх. Вельмі распаўсюджаным было гаданне дзяўчат з дапамогай люстэрка. Дзеля гэтага апоўначы ставілі перад люстэркам свечку і пільна ўглядаліся ў яго, чакаючы ўбачыць суджанага. Невыпадкова, што ўражлівыя дзяўчаты хутчэй за ўсё і «бачылі» ў люстэрку таго, каго хацелі ўбачыць.

Вядома таксама і гаданне з выкарыстаннем растопленага воску, які лілі ў халодную ваду і па фігуры, якая ўтваралася на вадзе, меркавалі (засноўваючыся на багатай дзявочай фантазіі) аб тым, які будзе жаніх.

Бралі, заплюшчыўшы вочы, на двары палена, неслі яго ў хату і там уважліва разглядалі. Гладкае, з тонкай карой палена «прадказвала» маладога, прыгожага жаніха; з тоўстай карой — багатага; без кары — беднага; крывое — старога або з фізічнымі недахопамі; з сучкамі — вялікую (па колькасці сучкоў) сям'ю.

Дзявочыя калядныя гаданні, як і іншыя народныя абрады і звычаі, сведчаць аб багатым духоўным жыцці нашых продкаў, іх паэтычным светапоглядзе. Спазнаць гэта мы імкнёмся зараз.

**Ул. КОВАЛЬ,**
**загадчык кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства, дацэнт.**

*Гэта цікава*

# ТВАР—ЛЮСТЭРКА ПРАЦАЗДОЛЬНАСЦІ

Народы Далёкага Усходу, Кітая, Японіі, Карэі, В'етнама ўжо тысячы гадоў падбіраюць работу і нават прафесію па сваіх рысах твару. Складзена нават вялікая картатэка ўсходніх сакрэтаў. Хочаце даведацца аб іх?

Станьце перад люстэркам і паглядзіце на свой нос. Калі ён адхілены ўправа, то вы больш здольны да фізічнай работы. Наадварот, калі нос адхіляецца ўлева, то чалавеку трэба развіваць розум. На думку ўсходніх урачоў, кончык носа мае сувязь з тыпам вышэйшай нярвовай дзейнасці. У спакойных, флегматычных людзей нос, як правіла, апушчаны. Калі нярвовая сістэма лёгка ўзбуджальная і напружаная, што бывае ў халерыкаў, то нос кароткі, прыўзняты. Такія людзі больш любяць і цэняць актыўнасць, рух, фізічную работу.

Цяпер паглядзіце на свае бровы. Калі яны апускаюцца да знешняга боку твару, гэта сведчыць аб вашай мяккасці, марудлівасці. Тэрміновыя справы вы выконваеце з цяжкасцю. Наадварот, калі бровы прыўзняты, гэта ўказвае на жывы склад розуму, здольнасць да рэзкіх перамен дзейнасці. Калі ж бровы зыходзяцца да сярэдзіны носа, то вы ад прыроды надзелены вялікай фізічнай сілай, схільнасцю да дасягнення мэты, жаданнем давесці любую работу да канца. Людзі, якія хутка стамляюцца, схільныя да гневу, запальчывыя, звычайна маюць вертыкальныя маршчыны паміж брывамі.

На Усходзе кажуць: «рот — люстэрка селязёнкі, а губы — адлюстраванне яе стану». Гэта, канешне, алегорыя, але ружовыя, вільготныя губы, як правіла, сведчаць аб добрым самаадчуванні, інтэлекце і сіле мышцаў. Зусім іншая справа, калі губы бледныя і сухія. У іх уладальніка звычайна «недахоп энергіі», дрэнная памяць, дзённая санлівасць, вяласць, стамляльнасць, недастатковая канцэнтрацыя ўвагі і г. д. Маленькі рот лічыцца ва В'етнаме прыкметай добрага кантролю над сваімі ўчынкамі і справамі, вялікай схільнасці да дасягнення мэты. Уладальнікі вялікага роту больш інертныя, расслабленыя, цяжэй даводзяць работу да канца.

Многае могуць расказаць і вочы чалавека. Так, на іх радужнай абалонцы праецыруюцца ўсе ўнутраныя органы і мозг. На думку англійскага спецыяліста Ф. Робертса, пры хранічнай стамляльнасці з'яўляецца воблачка зацямнення (пігментацыі) на вобласці праекцыі кары галаўнога мозгу. Адзін з японскіх даследчыкаў вялікую ўвагу надае суадносінам размяшчэння радужнай і бялочнай абалонак вачэй. На яго думку, калі радужная абалонка знаходзіцца ніжэй бялка вока, то чалавек мае схільнасць да ўспыльчывасці, агрэсіўнасці, нематываванай стамляльнасці. Калі ж радужная абалонка размешчана над бялочнай, то гэты чалавек мяккі як дзіця.

Цяпер адкрыйце рот і паглядзіце на свае зубы. На Усходзе лічаць, што яны нахілены ўнутр у халерычных, узбуджальных, нястрыманых людзей, якія не любяць манатонную работу. Наадварот, зубы выдаюцца ўперад у больш мяккіх, флегматычных, спакойных людзей. У ідэале зубы павінны быць прамыя, раўнамерныя.

Аб многім можа сказаць і ўражанне ад твару ў цэлым. Адкрытыя, шырокія рысы (вочы, нос, рот знаходзяцца на вялікай адлегласці адзін ад аднаго) — прыкмета добра развітага розуму, схільнасці да мысліцельнай дзейнасці. Не выпадкова адкрыты твар маюць многія вучоныя, пісьменнікі, паэты. І наадварот, сканцэнтраваныя, дробныя рысы твару больш уласцівыя настойлівым людзям, якія ўпэўнена дабіваюцца мэты ў рабоце і ў жыцці.

«Твар — адлюстраванне стану сэрца». Гэтая ўсходняя прымаўка, несумненна, мае матэрыяльную аснову. Людзі са слабым сэрцам часта худыя, нерашучыя, дрэнна кантактныя, яны лёгка падвяргаюцца стрэсам, хваляванням і маюць бледна-сінюшнае адценне скуры твару.

Лішак « энергіі» у сэрцы уласцівы фізічна моцным, але лёгка ўзбуджальным людзям з добрым колерам скуры твару.

Наколькі апраўданы ўсе гэтыя назіранні? Аўтар не бярэцца сцвярджаць, што яны абсалютна пацверджаны навукай. Але вялікі шматвекавы вопыт народных урачоў Усходу не трэба падвяргаць сумненню. Здзіўляльна тонкая назіральнасць старажытных урачоў у многіх выпадках аказалася дакладнай.

**В. ІВАНЧАНКА,**
**(«Сакрэты вашай бадзёрасці»).**




НАШЫ ЗА МЯЖОЙ.

Фота **У. Чысціка.**

## ПЛАВАННЕ

У г. Мінску адбыліся спаборніцтвы па плаванню за Кубак САФС (студэнцкая асацыяцыя фізкультуры і спорту). Зборная каманда ГДУ заняла пачэснае II месца. Найбольшага поспеху дабіўся студэнт I курса факультэта фізічнай культуры Сяргей Лізун, які стаў пераможцам на дыстанцыі 200 м комплекснага плавання. Прызёрамі гэтых спаборніцтваў на розных дыстанцыях сталі Алена Кукліна (II курс), Мікалай Каленкавіцкі (III курс), Аляксандр Шарамецьеў (II курс), Маргарыта Хлыстова (I курс), Вольга Коршыкава (II курс), Аксана Федарэнка (II курс). Зроблены яшчэ адзін крок да падрыхтоўкі да летняга чэмпіянату ВНУ і да чэмпіянату Рэспублікі Беларусь.

Нечакана слаба выступіла на гэтых спаборніцтвах член зборнай каманды краіны Вольга Коршыкава, якая значна знізіла аб'ём трэніровачных практыкаванняў. Хацелася б убачыць у Вольгі іншыя адносіны да трэніровак, і як вынік гэтага, узыйсці зноў на п'едэстал гонару.

**Б. ГІЛЬ,**
**трэнер каманды.**

# СПОРТ

## МІНІ-ФУТБОЛ

У спартыўнай зале нашага універсітэта прайшло занальнае першынство студэнцкай Асацыяцыі па фізкультуры і спорту па міні-футболу, дзе ў спрэчку ўступілі чатыры каманды.

Студэнты нашага універсітэта перайгралі каманды Гомельскага політэхнічнага інстытута — 6:5, Гомельскага кааператыўнага інстытута — 7:2 і БІІЧТу-10:7.

У выніку аднакругавога турніру тройка прызёраў выглядае так: ГДУ, ГПІ і БІІЧТ.

Нашы студэнты заваявалі пуцёўкі ў фінал.

Не магу з засмучэннем не адзначыць, што калі ў нашым універсітэце праходзяць платныя турніры, то факультэт фізічнай культуры не прыбягае да дапамогі кафедры фізічнага выхавання. Але калі трэба пасудзіць на грамадскіх пачатках (напрыклад, студэнцкую універсітэцкую або спартакіяду «Здароўе»), то не толькі выкладчыкаў факультэта фізічнай культуры днём з агнём не знойдзеш, але і няма ў спісах суддзяў-старшакурснікаў факультэта фізічнай культуры. Даводзіцца здзіўляцца, як гэта яны ўмудраюцца атрымаць суддзейскія катэгорыі, не абслугоўваючы спаборніцтвы? А можа спартыўным клубам гэта пушчана на самацёк і мы ўсе пажынаем засмучальныя плады, якія ярка праявіліся на студэнцкай універсіядзе па міні-футболу?

Рэдкія госці на студэнцкай універсіядзе дэкан факультэта фізічнай культуры і выкладчыкі спецыяльных кафедр. Студэнты ж (асабліва факультэта фізічнай культуры), адчуваючы бескантрольнасць, гавораць абразныя словы, грубяць, а часам і ўступаюць у бойку. Хацелася б, каб мы да гэтага бол[illegible] не вярталіся, а павярнул[illegible] тварам да спаборніцтваў, якія праходзяць у нас.

## БАСКЕТБОЛ

Зусім нядаўна ў нас прайшоў другі тур першага круга першынства студэнцкай Асацыяцыі па фізічнай культуры і спорту сярод мужчынскіх каманд у вышэйшай лізе.

Нагадаю нашым чытачам, што першы тур праходзіў у Брэсце, дзе нашы студэнты перайгралі каманды Брэсцкага і Магілёўскага педінстытутаў, а таксама каманду Беларускай політэхнічнай акадэміі.

Наша каманда, вядомая Б. Царыкавым, перамагла баскетбалістаў БІІЧТа — 81:62, Беларускай політэхнічнай акадэміі — 89:32, Беларускага інстытута фізічнай культуры— 97:56 і Гродзенскага універсітэта — 84:69.

Пасля другога круга лідэрства захапіла каманда ГДУ — 14 ачкоў, на другім месцы — ІФК — 12 ачкоў, на трэцім — Гродзенскі універсітэт і на чацвёртым — БІІЧТ — па 11 ачкоў.

У нашай камандзе хачу выдзеліць Рамана Пучкова (3 курс), Сяргея Быхаўцава (3 курс) і Юрыя Арлова (4 курс) — усе факультэт фізічнай культуры, а таксама студэнтаў фізічнага факультэта — Аляксандра Солгана (4 курс) і Сяргея Пінчука (5 курс).

Другі тур пройдзе ў лютым у сталіцы нашай рэспублікі — горадзе Мінску.

**В. МАРЧАНКА.**

**Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат біялагічнага факультэта, кафедра батанікі і фізіялогіі раслін выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту БАРАВІКОВАЙ Ганне Міхайлаўне ў сувязі з напаткаўшым яе горам — смерцю БРАТА.**

*Вясёлы перапынак*

# МАЛАЯ СТУДЭНЦКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

**МОЗГ** — орган, якім думаем, што думаем.

**НАСТОЙЛІВЫ** — студэнт, якога некалькі разоў выгналі за дзверы, урываецца праз акно.

**НАВУКА** — вечны пошук адказу на пытанне: ці я вучыўся, ці толькі праходзіў?

**ТЫДЗЕНЬ** — адрэзак часу, які ў студэнта складаецца з суботы і нядзелі і актыўнай пяцідзеннай падрыхтоўкі да іх.

**НЯВЕДАННЕ** — сіла, якая выкідвае студэнта з універсітэта.

**НАВАТАР** — студэнт, які кнігі бярэ ў бібліятэцы, а чытае ў кафэ.

**АПТЫМІСТ** — чалавек, які чакае не дачакаецца свайго вяселля.

**АПАДКІ** — студэнты, пакінутыя паўтараць той жа курс.

**АДКАЗ** (правільны) — прыемная нечаканасць, на якую выкладчык менш за ўсё спадзяецца.

**ВЫДАТНІК** —промень святла ў царстве цемры.

**ВОДПУСК** — час, калі студэнт спіць колькі пажадае, есць — калі захоча.

**ПЕНЬ**—студэнт, які не ўмее танцаваць.

**ПЕСІМІСТ** — жанаты аптыміст; б) добра інфармаваны аптыміст.

**ПІЛА** — інструмент грубай апрацоўкі; у вышэйшай школе сустракаецца рэдка: часцей трапляецца сякера.

**ПЛАВАННЕ** — адзін са шматлікіх метадаў здачы экзаменаў у студэнтаў. (Чаму не тоне, напрыклад, студэнт і алкаголік? Таму што першы заўсюды плавае, а другому мора па калена. — Заўв. рэд.).

**ПАГАРДА** — пачуццё, якое адчуваеш да суседа, калі ён на экзамене не ведае адказу на пытанні твайго білета.

**(«Студенческий меридиан»).**

## РЫТАРЫЧНЫЯ ПЫТАННІ

● Ці можна праводзіць палітыку бізуна і перніка там, дзе з мукой цяжка?

● Ці павінен падначалены лічыць сябе вінцікам, калі начальнік не шурупіць?

● Ці можна ўзяць слова з чалавека, у лексіконе якога толькі «трехэтажные...»?

● Ці можна звычайнае галаданне лічыць лячэбным?

● Ці можна зарабіць аўтарытэт на нізкааплачваемай рабоце?

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

«Гомельскі універсітэт» — газета Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны,
Спонсар газеты — студэнцкі саюз ГДУ.

Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта Беларусі па друку, г. Гомель, Савецкая, 1.

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

Аб'ём 1 друк. арк.

Тыраж 1.500 экз. Заказ 21.

Падпісана да друку ў 14.00.